# ДЗЕЯСЛОЎ

**Асноўныя паняцці:** дзеяслоў, спрагальныя і неспрагальныя формы, асновы дзеяслова, дзеясловы пераходныя і непераходныя, зваротныя і незваротныя, залежнага і незалежнага стану, закончанага і незакончанага трывання, катэгорыі ладу, часу, асобы; спражэнне і словаўтварэнне.

**1. Вылучыце групы дзеясловаў са значэннем: а) фізічнага дзеяння; б) руху, перамяшчэння ў прасторы; в) маўлення і думкі; г) працяглага стану; д) зменнага стану.**

**Укленчыць**, жаць, збочыць, **праставаць**, енчыць, забожкаць, шаптаць, абмяркоўваць, ачужэць, буяць, зарунець, **змізарнець**, палагаднець, пабагацець, пульхнець, цішэць, верашчаць, **крамянець**, пытацца, **шчадраваць**, ярчэць, бубніць, ляцець, несціся, жабраваць, самотнічаць, шкуматаць, сніць, шыбаваць, смяяцца, радавацца, **арфаваць**, **выстарцаваць**, дужацца, чэзнуць, **здзяцінець**, сасмягнуць, удзірванець.

**Прааналізуйце значэнні выдзеленых дзеясловаў**.

**2. Выпішыце з тэксту дзеяслоўныя формы, размяркоўваючы іх па слупках табліцы. Вызначце сінтаксічную функцыю кожнай дзеяслоўнай формы.**

| **інфінітыў** | **спрагальная форма** | **дзеепрыметнік** | **дзеепрыслоўе** |
|---|---|---|---|
| | | | |

Крыніца была рубленая. Да дошкі, прыбітай да апошняга вянца зруба, паналіпалі белыя парашуцікі з цёмна-карычневымі крапінкамі зярнятак – цяпер самае вялікае рассяленне розных дзікіх траў: насенне павыспявала і зараз спяшаецца як мага далей адляцець, там прызямліцца, зачапіцца за штонебудзь, а потым прарасці, пачынаючы на новым месцы сваю, новую калонію асоту, дзядоўніку, малачаю. Тыя, якім усё ж удалося вырвацца на сушэйшае, ляжаць на дошцы і, бы заземленыя зярнятамі, толькі пухам перавальваюцца з боку на бок і чакаюць мацнейшага ветру, які змог бы іх падняць і, не зважаючы на цяжар насення, панесці далёка і высока

У крыніцу ўжо нападала пажоўклае лісце. Густа ўслана ім вада. Крыніца нізкая, вада ў ёй недалёка, а таму даставаць яе лёгка: перагнуўся цераз зруб, расхіліў у бакі лісце, зачэрпнуў вядром, каб яно аж па самыя вушкі схавалася ў вадзе, і вось ён, той чысты крышталь, ад якога, бывае, у летнюю спёку не адарвацца: зубы заходзяцца, рукі млеюць, трымаючы навыцяжку вядро, а ты, здаецца, усё піў бы і піў, ніяк не наталяючы смагі.

Я. Сіпакоў.

**3. Вызначце граматычныя катэгорыі інфінітыва і яго сінтаксічную ролю ў сказах. Зрабіце марфемны разбор інфінітываў.**

1. Ты ідзеш абсохлаю абочынай пакланіцца руням маладым (Гіл.). 2. Буслы клякочуць, бусляняты пішчаць жалобна, як шчаняты, насы закідваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

угору і просяць есці ў сваю пору (К-с). 3. Люблю ў пагодную я ночку дапозна на дварэ сядзець, сачыць за зорачак мігценнем, на мясяц залаты глядзець (К.Б.). 4. Доўга і няўхільна развіваў Чорны ў сабе здольнасць мысліць гістарычна. Яму хацелася ўвасобіць мастацкімі сродкамі гісторыю свайго народа, асэнсаваць яе, звязаць сучаснае і мінулае (Стр.). 5. Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца. Вось яно – блізкае, яснае шчасце... (Бр.). 6. Паэты такога таленту і такога ўзроўню майстэрства, як Пімен Панчанка, нараджаюцца нячаста. І нямногім на зямлі выпадае шчасце жыць з імі ў адзін час, чуць іх голас, яшчэ ў рукапісе чытаць іх вершы, дзяліць сяброўскае застолле і споведную гамонку (Бур.). 7. Двойчы за лета садам не цвісці, двойчы не будзе ніколі ў жыцці светлага, яснага маю (Х. Ж.). 8. За бацькава сварыцца – і смех і грэх (Прык.). 9. Успомнілася прыгода, што адбылася з тутэйшым дзедам Панасам, які аднойчы паехаў да кума пагасцяваць (Парх.). 10. Лейтэнант недастаткова ведаў іх, тых, з кім неўзабаве прыйдзецца яму падзяліць славу або смерць, але выбару ў яго не было (В.Б.). 11. Дзед Аніс вучыў нас плесці кошыкі, капаць зямлянкі, ставіць буданы, а на дубах – вартавыя будкі. Вучыў ён нас і разгадваць таямніцы лесу, слухаць і разумець кожны гук у ім, умеў бачыць тое, міма чаго звычайна абыякава праходзяць людзі (Хомч.). 12. Пісаць – не сякерай часаць (Прык.).

**4. Выдзеліце ў дзеясловах аснову цяперашняга (будучага простага) часу і ўтварыце ад яе ўсе ўжывальныя ў сучаснай беларускай літаратурнай мове дзеяслоўныя формы.**

Абяссіліць, біць, смяяцца, крыўдаваць, зруйнаваць, пасівець, брацца, сячы, зрабіць, спаць, праведаць, увільваць, квітнець, злівацца, меркаваць, здабываць, ужываць, раздаваць, гнаць.

**5. Выдзеліце ў дзеясловах аснову інфінітыва і ўтварыце ад яе ўсе ўжывальныя ў сучаснай беларускай літаратурнай мове дзеяслоўныя формы.**

Згадаць, пісаць, звезці, насмяяцца, падзяліцца, аснавацца, запанаваць, змарнаваць, стагнаць, заіскрыцца, спарахнець, паружавець, вызначыцца, перапісаць, паліваць, падбіваць, спатыкаць, раскладаць.

**6. Прачытайце тэкст. Адкажыце, ад якой асновы ўтварыліся выдзеленыя дзеяслоўныя формы.**

Чамусьці кожную восень, пасля апошніх, не такіх грымотных, як улетку, навальніц, жураўлі, **кіруючыся** ў вырай, **праляталі** над Горскай, а дакладней, вынырвалі з-за пакатай гары нечакана, прыгожа і велічна. Селавы прастор ў гэты час быў ужо **зацягнуты** туманістай смугой, **пазначаны** журбой і шэрай аднастайнасцю позняга верасня. Пасярод голага і пустэльнага поля было дзіўна чуць тужліва-самотныя гукі, якія набліжаліся, раслі, **прымушаючы** міжволі задраць угару галаў. Вострым клінам жураўлі **спускаліся** над прасёлкам і тут, **убачыўшы** зялёны квадрат азімага жыта, важак рэзка ўзмахваў крыламі, зніжаўся над полем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І ў той момант, калі над галавой праплываў жураўліны вырай, хацелася плакаць – да таго сумна і маркотна было на сэрцы. Можа, таму, што жураўлі ніколі не **пралятаюць** міма людскіх сяліб з іх радасцю, бядой і горам. Пералётныя птахі даўно **прападуць**, **знікнуўшы** за **асмужаным** даляглядам, але яшчэ доўга здавалася, быццам і цяпер, у раптоўнай цішыні, над полем **вісіць** іх працяжнае і развітальнае “кур-л-ы”, “кур-л-ы!”

Паводле В. Гардзея.

7. **Выпішыце з тэксту пераходныя дзеясловы разам з назвамі аб’ектаў, на якія пераходзяць іх дзеянні. Вызначце формы выражэння гэтых назваў.**

У прыродзе можна назіраць дзіўную з’яву. Мёртвая, халодная і непрыступная скала прастаіць мільёны гадоў, вытрывае гарачую спёку лета і траскучыя марозы, дажджы ды навальніцы. А вось такое маленькае насенне бярозы, мікраскапічная і кволенькая крупінка, трапіўшы ў расколіну скалы і пусціўшы карэнне, з часам пранікае ўсё глыбей у цвердзь, і настае момант, калі непрыступная скала, якая памятае іхтыязаўраў і мамантаў, раптам не вытрымлівае націску бярозкі і рассыпаецца. Бо здаровы і дужы расток заўсёды знойдзе разумную дарогу, каб прабіцца да сонца, да кіслароду, да сокаў. Гэтак і з чалавекам. Не ў асаблівым розуме, не ў фізічнай сіле, не ў прыгажосці яго моц. Значэнне яго – у мэце, у велічы сэрца, у сутнасці імкненняў.

А. Карпюк.

**8. Спішыце сказы, падкрэсліце прама-пераходныя дзеясловы адной рыскай, непераходныя – дзвюма, а ўскосна-пераходныя – хвалістай. Чым адрозніваюцца прама-пераходныя дзеясловы ад непераходных і ўскосна-пераходных?**

1. Пры дарозе пыльнай, шумнай, недалёка ад сяла, адзінокай прыгажуняй груша стройная ўзрасла (Гіл.). 2. Месяц неяк адразу ж змізарнеў, зрабіўся бледны і кволы – яго амаль не відаць было ў небе, якое проста ўвачавідкі празрысцела, шырэла, зелянела, а на ўсходзе ўжо дзе-нідзе і ўсміхалася (Сач.). 3. Да маці, да мамы ў маленстве мы бегалі, калі нас, здаралася, крыўдзілі дзесьці... О маці – заступніца ! Маці мая!... (Гіл.). 4. Вы пачатак прыгажосці, вы – жыцця першапрычына, бачу будучыню вашу я ў служэнні хараству. Я цалую вашы рукі, беларускія жанчыны! Я схіляю перад вамі ў знак пашаны галаву! (Зв.). 5. Навокал рассцілалася поле, яшчэ даволі стракатае: за жаўтлявым спелым жытам зелянела бульба, з другога боку – сінеў лубін (Шам.). 6. Здольнасць да творчасці – найвышэйшы дар, якім узнагароджвае прырода чалавека на бясконцым шляху яго развіцця (Карп.). 7. Пасля ўчарашняй дзённай гарачыні брук і камяніцы горада дыхалі прыемнай прахаладай (Саб.). 8. Спарыш і дзяцельнік гусціліся ля дарог, цвілі і вялі жоўтыя кветкі (К.Ч). 9 Сілачом стаіць дуб разложысты, і здалёк відаць пышны верх яго (К-с). 10. Сады атрасалі пажоўклае лісце (А.Ч.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Утварыце зваротныя дзеясловы пры дапамозе постфікса –ся (-ца, -цца). Адкажыце, калі да дзеясловаў далучаецца постфікс –ся, а калі яго формы –ца і –цца. Высветліце, калі постфікс –ся (-ца, -цца) мае формаўтваральнае, а калі словаўтваральнае значэнні.**

Плесці, несці, стрыгчы, церці, валачы; будую, спыняю, адзяваю, мыю; кружым, убіраем, радуем, цягнем, вітаем; распушыш, падбярэш, раззлуеш, абаўеш; апранаць, раздзяліць, суцешваць, павесяліць, сцішыць; рашаюць, пераносяць, абіраюць, жуюць, здаюць; чытае, кідае, займае, правярае, выб’е, гне, пастукае.

**10. Спішыце сказы. Падкрэсліце зваротныя дзеясловы і ў дужках назавіце значэнне зваротнай формы гэтых дзеясловаў.**

1. І маці стала адзявацца, каб за работу тую брацца (К-с). 2. Пакоша ўжо не колецца, -- бяскрайнюю раўніну пакрыла светла-зялёная мяккасць атавы (Б.). 3. І размова не ціхла, не моўкла, не гасла, і віталася песня са сціплай сяброўкаю -- казкай (Луж.). 4. Я гляджу ў яе [маці] вочы, што свецяцца шчасцем, гладжу рукі сухія, прапахлыя зеллем, і хілюся да сэрца... А трэба б упасці перад ёю – нядужай, сівой – на калені... (Гіл.). 5. Серабрыцца снег, мігацяць незлічоныя мільёны брыльянцістых іголак, вецер-кусака шчыпле за шчокі, нос (Лыньк.). 6. Сонца часамі выкрадвалася з-за хмар, але восень, перад сканаццем сваім, любіла хмурнасць (К.Ч.). 7. Стары бабёр сабраўся пайсці туды. Ён шукаў дарогу да свайго прасторнага спрадвечнага пасялення... Ісці трэба было цяпер, бо пазней ці застанецца ў яго сілы, каб прывесці туды маладую сваю сям’ю, пабудавацца і пакінуць іх там, на спрадвечным месцы (Жук). 8. Марына пачала прыгожа адзявацца і выбрала сабе сталую прычоску, якая так была ёй да твару (К.Ч.). 9. Плыла, цалавалася хмарка з зямлёй (А.К.). 10. Ноччу часці спяшаліся запасціся боепрыпасамі і ўсім неабходным (Р.Н.). 11. Услухоўваючыся ў песню, Васіль радаваўся, што ў гэтым глыбінным і родным яму кутку было яшчэ столькі крылатых спевакоў (Я.С.). 12. Мінулае і сучаснае пераплятаюцца тут [на Полаччыне], дапамагаюць адчуць крокі гісторыі (М.Б.).

**11. Спішыце сказы, вызначце стан дзеясловаў. Адкажыце, якія дзеясловы незалежнага стану з’яўляюцца пераходнымі, а якія непераходнымі, зваротнымі ці безасабовымі.**

1. Давыдка здарожыўся і драмаў за сталом, прыхіліўшыся да цёплага матчынага пляча (Луж.). 2. Сэрца Максіма Багдановіча напоўнілася радасцю ад сустрэчы з гістарычнымі мясцінамі Вільні, вуліцы якой “ззяюць і гулка грымяць...” (Г.К.). 3. Прайшлі стагоддзі. Імя Францыска Скарыны заўжды асвятляла шлях нашаму народу з цемры да святла (Ам.). 4. Алень выцягнуў уперад шыю, прыклаўся мысаю да раны на бярэзіне і доўга стаяў, не адрываючы мысы (Карам.). 5. Здароўе і сумленне не прадаюцца (Прык.). 6. На берагах возера Свіцязь штогод праводзіцца свята песні (В.В.). 7. Тады ж, у даўнія часы, заўважаліся і апісваліся куды больш важныя асобы і падзеі – князі, цары, іх паходы і бітвы, тое, што адбывалася ў палацах і замках (Сач.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Сталёвы водсвет з’явіўся ў нябёсах, ён святлеў, ярчэў, званчэў, быццам сталь награвалі на агні (Дайн.). 9. Учора хмарыла, дзьмула. А сёння сонечна, ціха (Вор.). 10. Узышоў барвовы месяц, павіднела (Вор.). 11. Зямля пакрывалася цвёрдаю скарынкаю (К-с).

**12. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы залежнага стану, якія маюць творны дзейнага прадмета, адной рыскай, а дзеясловы залежнага стану, якія не маюць творнага дзейнага прадмета, дзвюма рыскамі.**

1. Пакуль чвякаў па мокрым лузе, [Васіль] зарасіўся па пояс (Дайн.). 2. Такія майстры, як Пётр і Таццяна Доўгеры, чые вырабы экспанаваліся на шмат якіх айчынных і замежных выставах, распісвалі свае вырабы дома (У.Я.). 3. Валуны складаюць неадлучную частку ландшафту Беларусі. На жаль, з кожным годам такіх камянёў становіцца ўсё менш і менш: яны выкарыстоўваюцца дарожнікамі і будаўнікамі, ад іх стараюцца пазбавіцца земляробы (Э.Л.). 4. Хата зноў асвятлялася ціхім і мяккім спакоем (Ад.). 5. Нам нішто не давалася лёгка. Усё здабывалася намі ў цяжкай працы і барацьбе (М.Е.). 6. Сэрца паэта напаўнялася радасцю ад сустрэчы з гістарычнымі мясцінамі Вільні... (Г.К.). 7. У цэнтры пляцоўкі панаваў стары дуб у чатыры абхваты, на яго ніжнім галлі развешваліся стракатыя стужкі і вышытыя ручнікі (Э.Л.). 8. Убачыўшы зробленыя гладышы, куфлі, чаркі, стары як бы анямеў, а потым раптам заплакаў, заліўся слязьмі (Сач.). 9. Мароз змяняецца адлігаю (К-с). 10. Здольнасць да авалодання словам даецца паэту ад прыроды (Гіл.). 11. Хвалёныя непрыступныя валы нямецкай абароны пратараньваліся з ходу (Вас.). 12. Лекавыя жалуды са святога дрэва цаніліся вельмі высока: за кожны жолуд – яйка (Э.Л.).

**13. Выпішыце спачатку дзеясловы, якія ўтвараюць суадносную трывальную пару, утварыце і запішыце трывальную пару; затым няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы, укажыце іх трыванне; а пасля двухтрывальныя дзеясловы.**

Дзьмухаць, раздаць, залежаць, даследаваць, матываваць, капаць, трымаць, увайсці, арандаваць, адсутнічаць, дыскрэдытаваць, падтачыць, канкрэтызаваць, апавядаць, падпяваць, адхіснуцца, расплакацца, рынуцца, актывізаваць, рэагаваць, прыбраць, радаваць, адчыняць, дараваць, нармаваць, калькаваць, прыдбаць.

**14. Дайце характарыстыку наступным дзеясловам паводле табліцы:**

| **Дзеяслоў** | **Трыванне** | **Сродкі ўтварэння трывальнай пары** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **прыстаўка** | **суфікс** | **чаргаванне ў корані** | **змены націску** | **Суплетыўная аснова** |
| | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Крычаць, выпісаць, чытаць, уявіць, аблажыць, рассы̀паць, мыць, будзіць, станавіцца, назваць, вы́разаць, знайсці, вязаць, праспаць, натыкаць, класціся, параўнаць, наладзіць, вымераць.

**15. Вызначце марфалагічнае падабенства і семантычнае адрозненне дзеясловаў кожнай пары, іх трыванне. Як называюцца такія дзеясловы? Утварыце суадносныя трывальныя пары, далучыўшы да іх аднолькавыя прыстаўкі. З пяццю парамі (на выбар) складзіце сказы і запішыце іх.**

Бегчы – бегаць, гнаць – ганяць, везці – вазіць, несці – насіць, ляцець – лятаць, лезці – лазіць, ехаць – ездзіць, каціць – катаць, плыць – плаваць, паўзці – поўзаць, ісці – хадзіць, весці – вадзіць, несціся – насіцца.

**16. Да кожнага з наступных дзеясловаў падбярыце і запішыце адпаведны дзеяслоў іншага трывання. Вызначце, ці з'яўляюцца ўтвораныя пары суадноснымі формамі трывання.**

Рыхтаваць, смяшыць, помсціць, аднавіць, падмесці, згадзіцца, абрабіць, спаслацца, адабраць, рабіць, пісаць, сушыць, лавіць, лысець, забаўляць, знішчыць, берагчы, выносіць, праспаць.

**17. Выпішыце з тэксту дзеясловы абвеснага ладу. Вызначце, якое дзеянне выражаюць гэтыя дзеясловы, іх час, асобу і лік.**

Язэп Драздовіч – постаць незвычайная ў гісторыі беларускага мастацтва, беларускай духоўнай культуры ўвогуле. Творчыя людзі такой свядомасці і характару звычайна не абмяжоўваюцца нейкі адным родам занятку – іх хапае на большае. Драздовіч быў не толькі выдатным жывапісцам, але і таленавітым графікам, самабытным скульптарам. А яшчэ ён збіраў народныя песні, запісваў словы для слоўніка беларускай мовы. Нехта падумае: а навошта яму, мастаку, было не сваім займацца? У тым і справа, што сваім: усё, чым ён займаўся, было ягоным, бо ён рабіў гэта ад душы і сэрца, бо ён ведаў, што гэта патрэбна культуры яго народа.

Біёграфы мастака сцвярджаюць, што і сэрца яго перастала біцца ў час вандроўкі па роднай зямлі, у дарозе. Ён вельмі любіў хадзіць па Беларусі, асабліва па роднай яму поўночна-заходняй Віцебшчыне. Сёння такіх вандроўнікаў сустрэнеш не часта – вандроўнікаў, бясконца ўлюблёных у вобразы роднай прыроды, у яе вячыстыя бары і пушчы, у сонечныя пагоркі, у зялёныя палеткі з белымі крушнямі камянёў на ўзмежках, у чароўны блакіт азёр, у звілістую каёмку кустоў і кусцікаў у шырокай лагчыне, пад якімі напэўна ж бруіцца рачулка. Ён любіў усё гэта так, што не мог без гэтага.

Паводле Н. Гілевіча.

**18. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы загаднага ладу, вызначце іх асобу і ўтварэнне.**

1. Я сімвал свой хачу прыкласці да лёсу вашага, сябры: хай будзе поўным ваша шчасце, як тое возера ў бары (Гіл.). 2. Адгукніся, вясна, мне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зязюляй з-за рэчкі, дай яшчэ раз прыпасці да любай зямлі і каштанаў сваіх незгасальныя свечкі над маёй адшумеўшай вясной запалі! (А.К.). 3. Ачышчайма ж, саскрабайма плех іржы, што сумленне раз'ядае непрыкметна! Каб душу сцінаў хоць зрэдку боль чужы. Каб ад радасці людской было ёй светла (Гіл.). 4. Над гэтым салдацкім капцом дарагім прашу аднагодкаў: праверце, ці не зараслі дзе да родных магіл сцяжыны – у полі і ў сэрцы! (Гіл.). 5. Не спіць начамі маці. Няхай сабе не спіць цяпер, абы спакойна спала, калі дачушцы ці сыну стукне сямнаццаць (Грах.). 6. Я не хачу гвалтаваць вашага сумлення, але давайце разважаць сур'ёзна (Кр.). 7. -- Хадзем, адпачнем трохі. Дарога цяжкая, стаміліся (Нях.). 8. Няхай яшчэ лётае воран, няхай яшчэ кружыцца век. Кахай мяне так, як учора – высока. Аддана. Навек! (Я.Я.). 9. Рвануўся б з месца, каб набраць паветра ў грудзі й жылы. ...Няхай ляцяць, ляцяць, ляцяць майго юнацтва крылы! (А.К.). 10. Акіян і космас вывучайце з добрым сэрцам, а яшчэ прашу: пакідайце і буслу, і чайцы больш вады і неба на душу (Панч.). 11. Давай лепш класціся спаць, ды няхай прысняцца табе добрыя сны (Лыньк.).

**19. Выпішыце дзеясловы загаднага ладу, вызначце іх формы і значэнні, якія яны маюць у сказах.**

1. Вырві дзеда з гэтай зямлі, разлучы з лесам, ляснымі ручаямі, глыбокімі ярамі, поўнымі чаромхі і шыпшыны, не дай яму слухаць шолах лісця, удыхаць водар смалы і ляснога ландыша – і дзед змарнее, засохне (Хомч.). 2. Свой сячыся, рубайся, а чужы не мяшайся (Прык.). 3. Якая вясна ў нашым скверы, сябры! Усё затапіла духмяная квецень. А тут – матаналіз: сядзі і зубры. Ну, дзе справядлівасць на свеце? (Гіл.). 4. Пакліч – былое адгукнецца жалейкаю за хваіной; скраніся – і важкой хадой наступнае ў паход кранецца (А.К.). 5. Апанасаўна ўсё ж улучае момант і на маю талерку кладзе два кусы кашанкі. Паспрабуй, адмоўся! (Парх.). 6. А ну, дзяўчаткі, заспявай песню! (Нях.). 7. Хлопцаў запрасілі падсілкавацца, а яны давай уцякаць (К-с). 8. Часцей, часцей прыпамінай імёны паўшых смерцю храбрых за родны край, наш мілы край, -- каб над зямлёй, што млела ў ранах, плыў гэты сіні-сіні ранак, цвіў гэты белы-белы май, -- часцей, мой друг, прыпамінай! (Гіл.). 9. Глядзі ты, колькі тут гэтага дзіцяці, а якое злоснае (Каратк.). 10. Каля аднапавярховага каменнага будынка ямской станцыі стаяла запыленая – хоць пальцам на ёй пішы – паштовая карэта (Каратк.). 11. –Што ж гэта такое! За імі тут да вечара прыбірай, спіны не разгінаючы, а яны хутка на галаву будуць пляшкі кідаць...(З.П.). 12. Не рабі ліхога і не бойся нікога (Прык.).

**20. Ад наступных дзеясловаў утварыце ўсе магчымыя формы загаднага ладу і запішыце іх.**

Плавяць, пасмяюцца, заносяць, пакладуць, глянуць, п'юць, возьмуць, жадаюць, стараюцца, садзяцца, лятаюць, ляцяць, становяцца, рашаюць.

**21. Спішыце сказы. Падкрэсліце дзеясловы ўмоўнага ладу і вызначце іх значэнне.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Бацькаўшчына! Колькі б мы ні хадзілі па тваіх дарогах, колькі б вёснаў ні сустракалі пад дахам тваіх нябёсаў, ніколі не здасца чэрствым твой хлеб і ніколі не будзе скупою твая рука (Луж.). 2. О, як бы я хацеў спачатку дарогу жыцця па парадку прайсці яшчэ раз, азірнуцца, сабраць з дарог каменні тыя, што губяць сілы маладыя, -- к вясне б маёй хацеў вярнуцца... (К-с). 3. –Ты схадзіў бы, Максімка, да іх, праведаў бы родных (Шам.). 4. Я музу параўнаў бы з роднай маці, ды слоў для параўнання нестае (А.К.). 5. Хутчэй бы прайсці, праскочыць гэта страшнае месца (Лыньк.). 6. Я б смяяўся, жартаваў бы, каб вас чуць развесяліць (К-с). 7. –Чаго вы так спяшаецеся? Пабылі б трохі, пагулялі. Пагасцілі б у новых сваякоў (К.Ч.). 8. Мінулае нельга зрабіць сённяшнім, якім бы ты ні быў разумным і моцным (Я.С.). 9. Адно, што параіў бы: не закончыўшы справы, ніколі не хваліся (Лыньк.). 10. Не наклікаць бы нам бяды! (Шам.). 11. Часта думаю: што, каб не матчына песня? Чым бы дыхаў? На холадзе чым саграваўся б? Папрасімцам, напэўна, бадзяўся б па свеце, жабраком між чужых і радні пабіраўся б (Гіл.). 12 Як бы ні старалася сталасць, а не сцерці ёй таго, што накрэсліла дзяцінства (Калес.).

**22. Выпішыце з тэксту асабовыя дзеясловы, вызначце іх асобу і лік. Падкрэсліце граматычны паказчык асобы.**

Многа мае прырода прынаднага і захапляючага для чалавека, але вось такога, як хадзіць па баравікі, -- другога такога няма! Сэрца ўзрываецца ад радасці і шчасця, калі выхапішся на мясцінку, дзе, здаецца, лес сабраў усе свае найдзівоснейшыя прывабы, каб зачараваць і паланіць душу грыбніка. Як вось сёння, ускочыў у малады барок і анямеў ад захаплення: тут і сівы мох з зялёнымі закрайкамі, і параскіданыя там-сям купкі верасоў, і аголеныя лапікі паміж сасонкамі, дзе на кожным кроку так і глядзі, так і чакай... А яшчэ вунь і маладыя бярозы ўкленіліся чародкаю ў баравіну, абяцаюць нешта таемнае, ззяюць чысцюткай белізною пад промнямі сонца, што нарэшце прабіла сцяну парнага туману. Столькі хараства, аж вочы разбягаюцца: на чым спыніцца, дзе самае незвычайнае? Адразу надарылася такое багацце, што закружыў без канца амаль на адным месцы, напаўняючы кош цупкімі, крамянымі чорнагаловікамі.

К. Кірэенка.

**23. Выпішыце з тэксту дзеясловы, абазначце канчаткі і растлумачце іх правапіс.**

Другі тыдзень запар ідзе дождж. Цярушыць і цярушыць, быццам праз сіта. А то часам і ветрам пацягне, ды такім непрыветным, што пальцы пачынаюць дубець. Здаецца, яшчэ тыдзень-другі – і на змену дажджу пасыплецца снег, ляжа на зямлю мяккім пухам, і заскрыпяць па белым некранутым першазімку вясёлыя сані.

Але вось зусім нечакана дождж перастаў ісці. Выбліснула сонейка. І ўсё навокал ажыло і павесялела... Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя мяккай задуменнасці і хараства. У паветры плыве павуцінне. Тонкія серабрыстыя валаконцы асядаюць на зямлю, чапляюцца за хмызы, платы, быльнёг. Зямля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

набывае матава-белы колер, а валаконцы ўсё ткуцца і ткуцца. Паглядзіш у бязмежны блакіт асенняга неба і раптам падасца табе, быццам вось-вось сыпане яно на зямлю чароўныя песні палявых жаваранкаў. Адчуўшы цяпло, ажываюць шмат якія заснуўшыя было на зіму насякомыя. Зноў з'яўляюцца стракатыя матылькі, мітусяцца ля чыстых люстраных лужын на глухіх лясных дарогах хуткакрылыя стракозы. А часам прагудзе над адзінокай кветкай калматы чмель, замармыча на ўзлессі цецярук-касач. Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў.

Паводле Р. Ігнаценкі.

**24. Вызначце па неазначальнай форме спражэнне дзеясловаў, пастаўце іх у форму 1-й і 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу. Абазначце канчаткі.**

Пабольшаць, знясіліць, гусці, бегчы, насіць, ссохнуцца, раззлавацца, раздзяляцца, прайсці, апалчыцца, абветрыць, гнаць, хітрыць, хітраваць, абяздолець, ткаць, гасціць, гасцяваць.

**25. Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу. Вызначце спражэнне і абазначце канчаткі.**

Пагоршыць, павярцецца, драмаць, вылучыцца, ездзіць, атабарыцца, паверыць, нацярпецца, загусціць, маладзець, выскачыць, прыдбаць, абзавесціся, адбегчыся, даць, падпаліць, аслабець, згусціцца.

**26. Выпішыце дзеясловы, утвораныя: а) суфіксальным; б) прэфіксальным; в) прэфіксальна-суфіксальным; д) прыставачна-постфіксальным спосабамі. У дзеясловах абазначце ўтваральную аснову і словаўтваральны фармант.**

Зляжацца, грукаць, несціся, папаездзіць, перасаліць, разда́цца, аб'есціся, налепліваць, ажывіць, адазваць, пракашляцца, меншаць, вы́купаць, паглыбіць, пячыся, ухітрыцца, мроіць, падкарміць, абяздолець, вітацца, удумацца, дваіць, разагрэць, узбушавацца, хмялець, дазваніцца, аступіцца, бялецца, абяднíць, налічыць, прыцярпецца, недаспаць, злюбіцца, красціся, выпраміць, гаспадарнічаць, выкаць, дэмабілізаваць, займацца, паблісквацъ, мініраваць, абмыліць, адкаркаваць, прыдрамнуць, нукаць, раздумваць, стукацца, раскрычацца, горкнуць, рыцца, нагаравацца, будавацца.

**27. Ад кожнай з прыведзеных часцін мовы ўтварыце дзеясловы прэфіксальна-суфіксальным спосабам. Зрабіце марфемны разбор утвораных дзеясловаў.**

І. Знак, імгла, пан, каталік, снег, кара́, закон, зброя, лес, доля.

ІІ. Бедны, добры, новы, прамы, смелы, ціхі, просты, жывы, круглы, сіні.

ІІІ. Стукаць, мяшаць, званіць, гуляць, танцаваць, ляпіць, гаварыць, драмаць, крапаць, калыхаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**28. Пастаўце дзеясловы ў неазначальную форму і ў форму прошлага часу. Запішыце іх, зрабіце марфемны разбор. Растлумачце правапіс суфіксаў.**

Здзекуюся, абсталюю, адфільтрую, даследую, субяседую, сталуюся, святкую, уратую, бунтую, размалюю, стартую, расходую, абрадую, камандую, расследую.

**29. Запішыце словы па-беларуску. Абазначце суфіксы і растлумачце іх правапіс.**

Отгадывать, раскапывать, оклеивать, упрашивать, выдумывать, вспахивать, стягивать, удваивать, заламывать, отстаивать, надаивать, уговаривать, доказывать, пристукивать, пристреливать, утачиваться, сосчитывать, протягивать, договаривать, обгораживать.

**30. Пры дапамозе суфіксаў *–ыва-, -іва, -ва-* ўтварыце парныя паводле трывання дзеясловы.**

Надаіць, надламаць, прачытаць, настаяць, упэўніць, дайграць, абляпіць, падкарміць, авалодаць, паказаць, удвоіць, узаконіць, абсмяяць, стрымаць, расцерабіць, выпісаць, падкрэсліць, вымасціць, падхапіць, запаяць, падагуліць, абяскровіць, падтрымаць, падскочыць, абумовіць.

**31. Выпішыце з тэксту дзеясловы, зрабіце іх марфалагічны разбор па наступнай схеме:**

**спрагальная форма:**

**1) пачатковая форма (інфінітыў); 2) лексіка-семантычная група; 3) аснова; 4) трыванне; 5) зваротнасць-незваротнасць; 6) стан; 7) пераходнасць-непераходнасць; 8) спражэнне; 9) лад; 10) час; 11) лік; 12) асоба; 13) род (для дзеясловаў прошлага часу); 14) сінтаксічная роля ў сказе.**

**інфінітыў:**

**1) аснова; 2) трыванне; 3) зваротнасць-незваротнасць; 4) стан; 5) пераходнасць-непераходнасць; 6) сінтаксічная роля ў сказе.**

Дзядзька заўсёды помніў, ды і цяпер помніць, усе святы. Ён любіць святкаваць, таму не абмінае іх.

Вербніца – свята вясновага абуджэння, і чалавек, устаўшы да сонца і наламаўшы галінак вярбы, на якіх распусціліся коцікі, прасіў у звычайнай вярбы здароўя.

Сёмуха. Усе чыста мятуць свае двары, вуліцы каля хат, а потым толькі нядаўна зазелянелы лес перасяляецца на некалькі дзён у вёску, каля варот і веснічак вырастаюць бярозкі, а ў хату нельга зайсці: там стаіць старажытны паўзмрок гутарлівага лесу – з гладышоў і збанкоў п’юць халодную ваду вялікія бярозы, уся столь упрыгожана галінкамі клёну і ліпы, а на белых, толькі што вышараваных масніцах – пахучы аер.

А шырокая па натуры сваёй масленіца – гэта разгул сялянскай весялосці перад вялікім пастом! На масленіцу старэйшыя прыходзяць да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

маладых паглядзець, як складваецца сям'я, як яны пражылі год і ці няма якой-небудзь крыўды паміж маладымі.

Паводле Я. Сіпакова.

**Заданні для самастойнай працы**

**1. Ад наступных дзеясловаў утварыце і запішыце формы часоў, вызначце трыванне. Зрабіце марфемны разбор утвораных формаў.**

**Варыянт 1**

Запісаць, раскусваць, высмактаць, вітацца, веяць, абяздоліць, гасціць, хітраваць, гудзець, хітрыць, карміць, знясілець, правіць, пабольшыць, несціся.

**Варыянт 2**

Гусці, ткаць, абяздолець, пабольшаць, графіць, сеяць, любіць, вырасціць, класці, забегчы, прынесці, ісці, прыкмячаць, бараніцца, вучыцца.

**2. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеясловы і вызначце іх час. Адзначце выпадкі ўжывання формы аднаго часу ў значэнні іншага часу.**

**Варыянт 1**

1. Глядзіш, бывала, і здаецца, што скрозь сцяну галін жывую, скрозь гэту тканку маладую ні мыш, ні пташка не праб'ецца (К-с). 2. Усё наўкруг дыхала цяплом, парна пахла, бо перад гэтым на вёску была найшла клубістая чорная хмара і хвілін колькі пырскаў дожджык (Сач.). 3. Выбежыш, бывала, з двара на паркан, акінеш вачыма неабсяжна шырокае неба, на якім то тут то там стынуць гурбы беласнежных воблакаў, -- і ногі самі нясуць на зялёную раскошу лужка (Сач.). 4. Прырода будзе абаронена ад небяспекі толькі ў тым выпадку, калі чалавек хоць трошкі палюбіць яе проста таму, што яна цудоўная (Парх.). 5. Марцін як лясне, як стрэліць пугай, дык рэха па сяле аж гадзіну разыходзіцца, а як затрубіць у берасцянку, дык каровы, як салдаты, маршыруюць (С.Ш.). 6. – Но, пайшлі, стаеннікі! (Панч.). 7. На досвітку сінім ярчэе мароз і свеціцца іней на голлі бяроз (Гіл.). 8. Заўтра едзем у горад паглядзець унукаў. Вялікія ўжо, у школу пойдуць (К-с). 9. Зрэдку праляціць якая-небудзь птаха, прысядзе на галіну адзінокай стромкай сасны (І.Н.). 10. Калі малады месяц дні за тры абгледзіцца, будзе гадзіць пагода да сходніх дзён (Луж.). 11. 1941 год. Пачатак вайны. Чуецца плач, крыкі. Гарыць зямля (Каратк.).

**Варыянт 2**

1. Не шукаючы, не знойдзеш (Прык.). 2. Панас і сапраўды быў падумаў, што на Месяц трапіў (Парх.). 3. Вучыўся Іванка так сабе. Болей цягнула яго да работы. Прыйдзе, бывала, са школы і, у кніжачку яшчэ не паглядзеўшы, ужо нешта памагае то маці, то бацьку (З.П.). 4. Доўга дзед думаў, а тады як крыкне, і той мядзведзь, як корак з бутэлькі, выскачыў з дупла (В.Б.). 5. Пайшлі, сябры, а то хутка пачне світаць (К-с). 6. Заўтра студэнты прыязджаюць з сельскагаспадарчых работ. 7. Вайна! Гарыць зямля, гарыць жалеза, гарыць усё жывое ў полымі вайны, а ў яго сэрцы жыве малое лясное

азярцо, тая рыба, што ў азярцы (Бял.). 8. А тут Антось як зарагоча! За ім адзін, другі паехаў (К-с). 9. Я тут спыню апавяданне, каб значны крок ступіць назад, жыццё мінулае крануць і ў цёмны кут яго зірнуць (К-с). 10. Не гадаю, з якое дарогі убачу я край любы мой – са Смаленскай, Чарнігаўскай ці старажытнай Цвярской, -- будзе дождж бушаваць ці аб каску звінець будзе горад – я ўвайду ў Беларусь, як байцы ўвайшлі ў Сталінград (Панч.). 11. І вось надарыцца часамі мароз над ўсімі маразамі; ідзе сярдзіта, пагражае, па даху гонтамі страляе (К-с).

**3. Спішыце сказы, падкрэсліце безасабовыя дзеясловы, дайце ім граматычную і лексічную характарыстыку. Адзначце выпадкі ўжывання асабовых дзеясловаў у безасабовым значэнні.**

**Варыянт 1**

1. На душы ціха і светла. Хораша думаецца, лёгка марыцца (З.П.). 2. Пахла дымам, смоллю, настоенымі густымі выпарэннямі сасновага бору. Ад ракі патыхала вільгаццю, няўлоўнымі пахамі прыбярэжнай твані, рыбнай цвілі (Лыньк.). 3. Ясным летнім днём прыпарыла, нахмарылася, пракаціўся гром па небе, па лесе, па траве (Бял.). 4. Калі адліжыла і засвяціла сонца, я выняў з акенца салому, каб усім у хляве стала лепш (Б.). 5 Прыпарыла, нахмарыла, яшчэ не загрукатала над галавою, але без памылкі бачыў, што неўзабаве ўдарыць пярун і лупане навальнічны дождж (Янк.). 6. Крыху павіднела – над галавою адкрылася неба (У.Я.). 7.Недзе ў кустах звінеў на каменьчыках ручай. Адтуль павявала халадком (Асіп.). 8. На полі задымілася вясной (Бр.). 9. Калі ж сыну горшала, дык часам нібы супроць волі зноў [Багдан] пачынаў адчуваць горкую крыўду і злосць да жывёліны (Кул.). 10. Кожнаму рупіла хутчэй даведацца, якую навіну прынёс з сабою Карташоў (Стах.). 11 На дварэ днела; шэрае святло прабівалася ў пакой праз шчыльную суравую фіранку (Ц.Г.).

**Варыянт 2**

1. Ад пылу, ад гарачыні пяршыла ў горле (Лыньк.). 2. Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому (К-с). 3. Дзядзьку моцна забалелі ныркі. Застудзіў ці што? І потым, дзе б ні лячыўся, колькі б ні грэўся на поўдні – усё-роўна не лепшала (У.Я.). 4. Хмарыла, як на дождж, а дожджыку ні кропелькі, і не горача, лес абапал дарогі цягнуўся светлы, лісцвяны перасыпаўся з хваёвым (Карам.). 5. Добра ўжо развіднела. Відаць было, як паабапал дарогі пажухла, зрабілася бурай ад спёкі трава (У.Г.). 6. Пахла прывялым, звільгатнелым ад расы палыном (У.Г.). 7. Пад кукурузнымі кучамі туляцца кароткія і зусім чорныя глухія цені. Часам здаецца – нехта шмыгае там ад кучы да кучы, позірк сам сабою напружваецца, але я ведаю: колькі ні ўглядайся – нічога не ўбачыш – гэта здаецца (В.Б.) 8 Ужо добра сцямнела, а снегавыя крупінкі ўсё сыпаліся і сыпаліся з хмарнага нізкага неба (В.Б.). 9. З захапленнем падумалася, што з такіх кволых парасткаў вырастаюць волаты-дубы (І.М.). 10. Развіднялася. Як лагодная ўсмешка, заяснелася неба на ўсходзе (К-с). 11. Раптам узняўся вецер і пацягнула вільгаццю (К-с).

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

## Дзеепрыметнік

**Асноўныя паняцці:** дзеепрыметнік, дзеяслоўныя і прыметнікавыя рысы, дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу, залежнага і незалежнага стану, ад’ектывацыя і субстантывацыя дзеепрыметнікаў.

**32. Выпішыце з тэксту дзеепрыметнікі, вызначце іх граматычныя прыметы, агульныя для дзеясловаў і прыметнікаў.**

Бацька павёў усіх нас на аблюбаваны ім пляц у канцы вёскі, калі можна толькі назваць вёскаю затравелую вуліцу, абапал якой чарнелі абгарэлыя платы ды зелянелі зарослыя высокім – у рост чалавека – бур’янам і палыном печышчы, гароды. Дзень той, помню, быў светлы, сонечны. Яснасць, празрыстасць разліты былі ў паветры, як бываюць разліты яны ў жоўтых, даспелых антонаўках, што здымаюць з яблынь у познюю восень, перад самым ліставеем. Усё наўкруг: зямля, абпаленая цэгла, дрэвы, зеляніна – дыхала цяплом, парна пахла, бо перад гэтым на вёску была найшла клубістая чорная хмара і хвілін колькі пырскаў дожджык. Было так ціха, што чуваць было, як недзе, зашыўшыся ў траву, цвірчэў конік. Спявала-залівалася ластаўка, стракатала ў чыімсьці здзічэлым садзе сарока. Ад цяпла, ад пахаў роднай зямлі, ад песень нашых тутэйшых птушак і ад таго, што мы нарэшце дома, у сваёй вёсцы, жывыя, здаровыя, усім нам было нязвыкла радасна, добра.

Б. Сачанка.

**33. Утварыце ад дзеясловаў уласцівыя беларускай мове дзеепрыметнікі, запішыце і зрабіце іх марфемны разбор. Вызначце, ад якіх асноў утварыліся гэтыя дзеепрыметнікі.**

Раскарміць, зжаць, зрабіць, спазнаць, размыць, мяняць, сцерці, прачытаць, вызываць, авеяць, расклеіць, пасеяць, біць, мыць, пачырванець, пажоўкнуць, стаптаць, атрымаць, памерці, знесці, абнадзеіць, напісаць, разлюбіць, заўважыць, сапсаваць, абсыпаць, кінуць, падхапіць, абліваць, ушчуваць.

**34. Выпішыце дзеепрыметнікі, якія маюць наступную будову: ¬⋂^^□**

Засеяны, прачытаны, прыгорблены, выпраўлены, авеяны, разгневаны, пачарнелы, звіты, расклеены, затуманены, растраляны, зламаны, разграфлёны, вымыты, памерлы, набракнуты, стаптаны.

**35. Ад запісаных у дужках дзеясловаў утварыце дзеепрыметнікі і запішыце сказы. Вызначце сінтаксічную ролю поўных і кароткіх дзеепрыметнікаў у сказе.**

1. Быў першы год вайны. Знясіл...ыя, скрываўл...ыя няроўнымі баямі, нашы адступалі (З.П.). 2. Там, на самым краі светлай баравіны, было суха,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цёпла ад зямлі, нагрэ...ай сонцам, густа ўсыпа...ай шорсткім шыгаллем і кволымі лусачкамі маладой кары (Стр.). 3. Далі былі ўбра...ы ў ружова-сонечныя хмызнякі, у змрочна-сінявыя лясы (Бяд.). 4. Шукаючы зручнага для пераправы месца, Палазок заўважыў схава...ы ў кустах рыбацкі човен (К-с). 5. Маленькая палянка ў гушчары абгародж...а старым парканам, і над ёй, над суседнімі дубамі і бярозамі, узняўся вялізны і стройны дуб (Хадк.). 6. Дол быў усла...ы рудым лісцем, сухой рыжай папараццю, доўгаю, пераблыта...аю, як іржавы дрот, травою, друзам збуцве...ых галінак (Дам.). 7. Гэта быў звычайны чыгуначны пераезд, якіх нямала параскіда...а на сталёвых шляхах зямлі... (В.Б.). 8. Цяжка пералічыць, што здабы...а намі, пабудава...а, заваява...а (М.Г.). 9. Па гурбах, моцна змец...ых ветрам, можна было смела ехаць на санях (Жук). 10. У поўдзень мы, стомл...ыя, трохі п’яныя ад маладога, свежага паветра і цішыні, дабраліся нарэшце да Сабінінай дачы (Сач.). 11. За сялом, аддзел...ая жоўтымі палосамі намы...ага з гарыстых палеткаў пяску, стаяла цёмная кузня (Скр.). 12. Дома таксама не спалі, дзверы ў сенцы былі не зашчэпл...ы (Стр.).

**36. Спішыце сказы. Падкрэсліце дзеепрыметнікі, якія перайшлі ў прыметнікі ці назоўнікі. Раскрыйце ўмовы і прыметы (лексічныя, граматычныя) ад’ектывацыі і субстантывацыі.**

1. Дзеці з цікавасцю слухалі незнаёмую для іх мову, з якой прыйшло сюды такое таямнічае слова – вожаг (Я.С.). 2. Перад станцыяй цягнулася некалькі радоў калючай агароджы...(Б.) 3. Я толькі з любімай магу захапіцца ўспененым морам, паводкай зары (Панч.). 4. Я, ўлюбёны ў жыццё, не скаруся пагрозе на праводзінах тых, на памінках старых (А.К.). 5. Не раз уладары, шчаслівыя і закаханыя, спынялі час (М.Т.). 6. Выбраліся на бераг ледзь жывыя, аблепленыя тванню, дрыжачыя ад холаду (Я.М.). 7. Бацька і маці пайшлі да знаёмых у госці, а Віця застаўся дома (Як.). 8. Толя падсек, і на канцы лескі, пад вадой пачулася даўно жаданае далікатнае супраціўленне (Б.). 9. Ад гутаркі з Якавым у Андрэя быў такі душэўны стан, што як быццам яго напаіў хто гаючай вадой (Пестр.). 10. Невядомай сцежкай мы пайшлі да родных мясцін, да нашай хаты (Каратк.). 11. Неба ўсю глыб ажывіўшы, патроху праз цемнь выглядалі зорак дрыжачых вянкі (Багд.). 12. Ляжыць зямля стамлёна, нема і сніць той непаўторны міг, калі ў грамах падорыць неба ёй ласку кропель дажджавых (Бур.).

**37. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Растлумачце, якімі сродкамі можна перадаць значэнне рускіх дзеепрыметнікаў.**

Снег сошел, оставшись еще кое-где грязными рыхлыми клочками в лощинах и тенистых перелесках. Из-под него выглянула обнаженная, мокрая, теплая земля, отдохнувшая за зиму и теперь полная свежих соков, полная жажды нового материнства. Над черными нивами вился легкий парок, наполнявший воздух запахом оттаявшей земли, -- тем свежим, вкрадчивым и могучим пьяным запахом весны, который даже и в городе узнаешь среди сотен других запахов. Мне казалось, что вместе с этим ароматом вливалась в

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мою душу весенняя грусть, сладкая и нежная, исполненная беспокойных ожиданий и смутных предчувствий, -- поэтическая грусть, делающая в ваших глазах всех женщин хорошенькими и всегда приправленная неопределенными сожалениями о прошлых веснах. Ночи стали теплее; в их густом влажном мраке чувствовалась незримая спешная творческая работа природы…

А. Куприн.

**38. Выпішыце з тэксту дзеепрыметнікі (дзеепрыметныя словазлучэнні). Зрабіце разбор дзеепрыметнікаў па наступнай схеме: 1) пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду); 2) стан (залежны, незалежны); 3) час (цяперашні, прошлы); 4) трыванне (закончанае, незакончанае); 5) род (для дзеепрыметнікаў адзіночнага ліку); 6) лік; 7) склон ( для поўных дзеепрыметнікаў); 8) сінтаксічная роля ў сказе.**

Адзінокая постаць чалавека то з'яўлялася, то знікала ў негустым бярозавым падлеску, сярод высокіх, памкнутых да неба хвой. Гэта быў невялічкі малады хлопец у зашмальцаваным салдацкім бушлаце, у зімовай шапцы на галаве. З-пад расхрыстаных каўняроў яго апратак на грудзях выглядала некалькі палосак зношанай цяльняшкі. Схуднелы хлапечы твар нёс выраз немаладога клопату, амаль сполаху. Салдат ішоў нетаропка, часта спыняючыся, часам мяняючы напрамак хады, штораз азіраючыся назад і па баках.

Прапахлы хвояй лес між тым поўніўся ветраным шумам, які несціхана мкнуў з вышыні і стараўся заглушыць усе іншыя гукі. Зрэшты, салдат ужо навучыўся ў звыклым пошуме лавіць які іншы гук, ягоны слых заўжды быў насцярожаны. Закіданы дробнымі шышкамі дол быў па-вясноваму голы і шэры, хіба сям-там зелянеў чарнічнік ды, як заўжды, на грудках шарэлі лапікі беламошніку, ступаць па якім было мякка, бы па дыване ў пакоі.

В. Быкаў.

## Дзеепрыслоўе

**Асноўныя паняцці:** дзеепрыслоўе, дзеяслоўныя і прыслоўныя рысы, дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання, часавыя значэнні дзеепрыслоўяў, адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў.

**39. Спішыце сказы, падкрэсліце дзеепрыслоўі, вызначце іх граматычныя прыметы, агульныя для дзеяслова і прыслоўя.**

1. Знаходзячыся ў цэнтры духоўнага жыцця Полацкага княства, Еўфрасіння Полацкая нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, зрабілася нашай першаю мецэнаткай (У.А.). 2. Блукаючы па Траецкім прадмесці, цяжка ўявіць лад тагачаснага жыцця, але вобраз старога горада ўсё ж ствараецца (Дайл.). 3. Дачуўшыся пра заўчасную смерць бацькі, Марыся зацялася (Баж.). 4. Маці не выцерпела – пабегла ў хату і вынесла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зняўшы з ложка, палатняную пасцілку (Пташ.). 5. Пакруціўшыся, пахадзіўшы вакол, знайшоў Цікаўны зламаную лясіну, прыставіў яе да сцяны і палез наверх (Я.С.). 6. Жонка, вярнуўшыся з цёмнага ўжо двара і борздка скінуўшы ватовачку і хустку, мыла рукі над мядніцай (Дал.). 7. Кім ён [Банадысь] стаў, цалкам паддаўшыся жонцы? Знялюдзеў адзін у лесе, ад усіх адарваўся... (Сач.). 8. Жывучы, рабі ўсё сам і май натуру, каб не надакучваць нікому і каб ніхто ніколі не папракаў цябе, што ты з чужога жывеш (К.Ч.). 9. Хлопчык з вудачкаю сядзеў над ракою, забыўшыся пра ўсё на свеце (І.Г.). 10. Нельга не ўстрывожыцца тым, што наша школа, узбройваючыся тэхнічна, паспяхова засвойваючы самую сучасную інфармацыю, як гэта ні прыкра, зніжае свой галоўны паказчык – пісьменнасць (Віт.).

**40. Выпішыце са сказаў дзеепрыслоўі. Вызначце, як яны ўтварыліся (ад якіх дзеяслоўных асноў і з дапамогай якіх суфіксаў) і якога яны трывання. Укажыце сродак выражэння трывання.**

1. Чалавек нараджаецца для таго, каб плакаць і радавацца, кахаць і ненавідзець, а потым памерці, забраўшы з сабою ў нябыт цяжар перанесеных пакут і радасцей (У.Р.). 2. Усе дні, сунімаючыся трохі пад вечар, вострым скразняком гайсаў кусліва паўночна-ўсходні ветрадуй (У.Я.). 3. Задумаўшыся, Алег крочыў ля доўгага, на цэлы квартал, дома (Я.С.). 4. Натрапіўшы на ласіную пераправу, ляснік, стаіўшы дыханне, стаяў над ляшчынаю на строме і назіраў, як у яго любімы лес перасяляецца гэтая прыгожая сям’я (Кір.). 5. У засені зараснікаў нерухома стаяць вялізныя, як плашкі, шчупакі, пільнуючы сабе наедку (Луж.). 6. Не спяшаючыся, дзед сеў за стол на покуце, паклаў рукі перад сабой на чысты абрус (Асіп.). 7. Хто не імчаўся, як вол у часе гізу, задраўшы хвост, на спатканне ўсякім прыгодам-нягодам (К-с). 8. І, сёрбаючы булён, жуючы аладкі ці дранікі, ты зноў жа будзеш думаць, чым бы заняцца, што б такое знайсці рабіць, каб ані не здоўжыўся дзень... (Сач.). 9. Дзядзька Саўка ішоў, не шкадуючы сваёй старэнькай хромкі, якую ён прывёз з вайны, ішоў і, аж заломваючы мяхі, іграў хуткую польку (Я.С.). 10. І наўсцяж краінаю, радасць услаўляючы, песні салаўіныя льюцца не сціхаючы (Гл.). 11. Зранку лагодна свяціла сонца, хораша парылася, падсыхаючы, зямля (Рыб.). 12. Разграбаючы цяжкімі крыламі паветра, чарада варон праплыла над Малінаўкаю і знікла за стрэхамі крайніх хат (У.Р.).

**41. Утварыце ад наступных дзеясловаў дзеепрыслоўі незакончанага (частка I) і закончанага (частка II) трывання. Абгрунтуйце ўжыванне выбранага суфікса.**

I. Хацець, віць, біць, вузець, вузіць, гусціцца, кланяцца, жартаваць, спяліць, спакайнець, завіхацца, хадзіць, адносіцца, пячы, тушыць, ляжаць.

II. Прыгледзецца, зачырваніць, зачырванець, пазванчэць, паснедаць, прынесці, прыбегчы, вярнуцца, прыладзіцца, адвезці, дапамагчы, засцерагчы, вычарціць, паблытацца, замокнуць, аддаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**42. Знайдзіце сказы з няправільна выкарыстанымі дзеепрыслоўямі і выпраўце памылкі.**

1. Пятрусь кінуўся ўбок і, сам не памятаўшы, апынуўся на галіне ліпы. 2. Заўважыўшы, што зубр разгневаўся не на жарт, нам стала страшна. 3. Шчыра спачуваючы бабульцы, у нас узнікла жаданне ў тую ж хвіліну дапамагчы ёй. 4. Спачатку, не прыглядаючыся, нельга было зразумець, хто і куды ідзе. 5.Не паклаўшы, не знойдзеш. 6. Прыходзячы рана на заняткі, у класе было яшчэ цёмна. 7. Не дайшоўшы да хаты крокаў дзесяць, злосны сабака выскачыў з-пад варот. 8. Разліўшыся цэлымі азярынамі, прыемна пах ліловы чабор. 9. Прайшоўшы заараны пад цімафееўку лужок, наперабой застракаталі пільныя сарокі. 10 Жаўшы жыта, жанчыны стамляліся і часта адпачывалі.

**43. Спішыце сказы, ставячы знакі прыпынку. Падкрэсліце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя словазлучэнні, вызначце іх сінтаксічную ролю ў сказе.**

1. Страла ціўкнуўшы прарвала паветра і ўпілася аленю пад лапатку (Парх.). 2. Жвавейка ціха не спяшаючыся ішоў па тратуары не выбіраючы сушэйшага не зважаючы на лужы, што цямнеліся ў выбоінах на асфальце не адчуваючы, што ногі ў яго мокрыя (Я.С.). 3. Выехаўшы на невялікую лугавіну і пакінуўшы веласіпед узбоч дарогі Макар Ігнатавіч з сынам накіраваліся на ўскраіну лесу (Хадк.). 4. Берагам ужо ацярэбленага і прарэджанага хвойніку, дзе згледзеўшы мяне наперабой застракаталі пільныя сарокі, я падышоў да адзінокай яблыні (Ад.). 5. Падняўшы высока галовы задумліва жавалі жуйку сытыя ўжо каровы і не варушачыся глядзелі на дарогу нібы спрабуючы ўявіць, ці дужа цяжкім будзе для іх сённяшні пераход (Я.С.). 6. Горад навесяліўшыся натанцаваўшыся насмяяўшыся і стаміўшыся ля навагодніх ёлак і ў святочных застоллях не зважаючы на тое, што ўжо разаднела, усё яшчэ спаў моцным сном. (Я.С.). 7. Піхнуўшы нагою ў дзверы я ўляцеў у пакой і раззлавана кінуў шапку на стол (З.П.). 8. Ля ганка мы спыніліся нібы баючыся нібы не маючы сіл пераступіць апошнюю, страшную мяжу... (З.П.). 9. На грудку тлуста паблісквалочы між ружовага ад смолкі поплаву бегла сцежка, густою шчоткаю стаяў і выпусціўшы карычнявата-бліпічастыя асцюкі ціха шапацеў ячмень (Ад.). 10. Жаваранак і шпак спяваючы не хаваліся (Б.). 11. Салдат асцярожліва пайшоў па сцежцы асабліва не дбаючы куды (В.Б.). 12. Купіўшы білеты мы даволі лёгка прайшлі ў адмыслова выкладзеныя арачныя вароты, апынуліся ў самім манастыры (Сач.).

**44. Выпішыце з тэксту дзеепрыслоўі (дзеепрыслоўныя словазлучэнні). Зрабіце марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў па наступнай схеме: 1)дзеяслоўная аснова, ад якой утварылася дзеепрыслоўе; 2) зваротнасць – незваротнасць; 3) трыванне (закончанае ці незакончанае); 4) пераходнасць – непераходнасць; 5) сінтаксічная роля ў сказе.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па акне барабаніў дакучлівы дождж. Маленькія кропелькі на шыбах хутка большалі ад дажджынак, увачавідкі цяжэлі і, нібы пабраўшыся за рукі, паволі скраналіся з месца. Спачатку яны паціху сунуліся ўніз, убіраючы ў сябе ўсё больш і больш гэткіх жа, як самі, кропелек – усё набіралі разгон, -- а потым імкліва, нібы ўрэшце адважыўшыся, віхляючы, быццам тыя рухавыя галавасцікі-апалонікі, шукаючы зручнейшай, пракладзенай ужо да іх на мокрым шкле сцяжыны, паспешліва кідаліся ўніз і імчалі ўсё хутчэй і хутчэй, пакідаючы за сабою вільготныя звілістыя пісягі.

*Я. Сіпакоў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ